таў фарміраванню ў іх адзінага сэнсавага поля ў адносінах да комплексу прафесійных паняццяў, развіццю цэласнага бачання свету і разумення месца ў ім сваёй прафесіі.

**Э.С.Суддзя,** *дацэнт*

# МЕТАДЫ ПЕРАДАЧЫ ВЕДАЎ ПА ГАЛІНОВЫХ КУРСАХ У ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ БІБЛІЯТЭКАРАЎ-БІБЛІЁГРАФАЎ ВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Набыццё студэнтамі прафесіяналізму важнае не столькі ў сэнсе засваення ведаў, колькі ў развіцці творчых здольнасцей, павышэнні ўвагі да ўсяго передавога, фарміраванні ініцыятыўнасці, якая грунтуецца на высокай інтэлектуальнай культуры. Вырашэнне такой складанай задачы немагчыма без комплексу разнастайных метадаў навучання.

Мы спынімся толькі на тых, якія выкарыстоўваем пры вывучэнні курса «Бібліяграфія мастацкай літаратуры, літаратуразнаўства і мастацтва» і якія, як мы пераканаліся ў працэсе выкладання, адпавядаюць канцэпцыі развіваючага навучання.

Эксперыментальныя даследаванні ў галіне педагагічнай псіхалогіі Г.С.Касцюк, У.У.Давыдава, Дз.Б.Эльконіна і іншых паказалі вызначальную ролю тэарэтычных ведаў ужо на пачатковым этапе навучання. Таму вялікае значэнне набываюць тыя метады, якія накіраваны на развіццё ў студэнтаў здольнасці да абагульнення. Напрыклад, яна можа фарміравацца ў ходзе абагульненага распазнавання малазнаёмых аб'ектаў у мастацтве і літаратуры ў крыніцазнаўчых тэмах курса, пры асэнсаванні маральных якасцей персанажаў падчас чытання мастацкай літаратуры і яе анатавання, пры вывучэнні класіфікацыі бібліяграфічнай прадукцыі, авалодання разумовымі аперацыямі (параўнанне, аналіз, сінтэз) праслухоўвання лекцый і пры ўдзеле ў семінарскіх занятках.

Метад абагульнення, напрыклад, дапамагае студэнтам у засваенні тэмы "Сістэма бібліяграфічных прадуктаў па мастацтве". Абапіраючыся на гэты метад, студэнт здольны мысленна прасачыць узнікненне прыватных і адзінкавых асаблівасцей сістэмы.

Адны і тыя ж пытанні тэмы могуць вывучацца з рознай глыбінёй. Так рэалізуецца метад дыферэнцыяцыі на занятках па тэмах «Аналіз методыкі стварэння навукова-дапаможных дапаможнікаў па мастацтве», «Аналіз методыкі стварэння рэкамендацыйных дапаможнікаў па мастацтве» і аналагічных тэм па бібліяграфіі мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства. Сутнасць метаду ў тым, што заданні прапаноўваюцца з улікам індывідуальнага ўзроўню ведаў і ўменняў, з улікам пераваг і мэтавых установак канкрэтнага студэнта. Заданне сярэдняй складанасці прадугледжвае запаўненне граф схемы адказамі і аналіз 4–5 дапаможнікаў з розных класіфікацыйных радоў. Ускладнёнае заданне прадугледжвае не толькі павелічэнне колькасці дапаможнікаў да 8, але і спроб падсумоўвання практычных рашэнняў, выдзяленне найбольш эфектыўных для дадзеных мэт.

Асваенне інфармацыйнай прасторы – адзін з галоўных навыкаў, неабходных студэнту факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм. У яго фарміраванні значная роля належыць актыўна-дыялогаваму метаду навучання. Увядзенне ў курс шматварыянтных пошукавых праграм па тэмах «Бягучая бібліяграфічная інфармацыя па мастацтве» і аналагічная па літаратуразнаўстве, «Рэтраспектыўная агульналітаратурная бібліяграфічная інфармацыя», «Персанальная навукова-дапаможная бібліяграфічная інфармацыя па мастацтве», «Тэматычная літаратурная бібліяграфія» і іншых дазваляе рэалізаваць студэнтам свой інтэлектуальны, творчы патэнцыял.

На працягу многіх гадоў намі выкарыстоўваецца метад апасродкаванага кіравання. Ён рэалізуецца шляхам распрацоўкі заданняў, якія самастойна выконваюцца студэнтамі. Заданні маюць рэпрадуктыўны і пошукавы, творчы характар. Так, пры выкананні задання па аналізе трох спецыяльных стандартаў па



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічным апісанні выданняў выяўленчага мастацтва, нотных выданняў і аўдыёвізуальных дакументаў выкарыстоўваюцца рэпрадуктыўны і ілюстрацыйны метады.

Выкарыстанне метаду згорнутых інфармацыйных структур дазваляе выпрацаваць у студэнтаў навыкі згортвання інфармацыі па літаратуры і мастацтве, ствараючы розныя формы: анатацыі, рэфераты, прэс-рэлізы і іншыя крыніцы інфармацыі з рознымі мэтавымі праграмамі, метадычнай накіраванасцю, карыстальніцкім інтарэсам.

Кібернетычны падыход, пры якім асновай выступаюць спосаб кіравання пазнавальнай дзейнасцю і характар устанаўлення зваротнай сувязі, прадугледжвае выкарыстанне метадаў алгарытмізацыі і праграміраванага навучання (Т.А.Ільіна, Л.М.Ланда і інш.).

Метад алгарытмізацыі выкарыстоўваецца ў выкладанні курса “Бібліяграфія мастацкай літаратуры, літаратуразнаўства і мастацтва” пры фарміраванні рэпрадуктыўнага мыслення. Вызначаючы лепшыя дапаможнікі, базы даных, станоўчыя метадычныя рашэнні сярод створаных, ужо існуючых, і паўтараючы іх ва ўласных бібліяграфічных прадуктах, студэнты (асабліва студэнты-завочнікі) фарміруюць і шліфуюць сваё рэпрадуктыўнае мысленне.

Даследчыцкі метад, напрыклад, выкарыстоўваецца ў адным з практычных заданняў, якое прадугледжвае фарміраванне ядра даведачна-бібліяграфічнага фонду па мастацтве (літаратуразнаўстве) для пэўнага тыпу бібліятэк. Студэнты маюць як рэальныя бібліяграфічныя і фактаграфічныя крыніцы інфармацыі па мастацкай літаратуры, літаратуразнаўстве, так і больш разгорнутыя спісы гэтых крыніц, у тым ліку і пералік некаторых баз даных. Пры гэтым можна выкарыстоўваць нарматыўны выбар (г.зн. просты даследчыцкі метад), абапіраючыся на метадычныя рэкамендацыі, дырэктыўныя дакументы, вучэбныя выданні і экзістэнцыянальны выбар (г.зн. складаны даследчыцкі метад), пры якім кожнае сваё рашэнне неабходна даказаць пры дапамозе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уласных аргументаў ці набытых пры чытанні тэарэтычнай літаратуры, аналізе методыкі лепшых бібліяграфічных прадуктаў.

Задача канструявання магчымых варыянтаў абапіраецца на разнастайныя і даволі складаныя кагнітыўныя працэсы і механізмы. Трэба звязаць паміж сабой мноства фактараў і прыёмаў, вылічыць і экстрапаліраваць тэндэнцыі, уявіць вынікі прыняцця пэўных рашэнняў. Зразумела, такая дзейнасць пасільная не для кожнага студэнта. Маючы гэта на ўвазе, мы прапануем працаваць «тройкамі», таму што вынік мазгавой атакі траіх у сукупнасці дае больш эфектыўны рэальны вынік, які дазваляе прапанаваць шляхі задавальнення розных інфармацыйных запытаў і павысіць такім чынам надзейнасць структураванасці даведачна-бібліяграфічнага апарату па мастацкай літаратуры, літаратуразнаўстве і мастацтве.

У заключэнне адзначым, што выкарыстанне разнастайных метадаў у іх комплексе ў працэсе навучання дапамагаюць выпрацаваць у студэнтаў уважлівасць, дысцыпліну, стрыманасць, назіральнасць, цярплівасць, вытрымку, працавітасць, акуратнасць, сістэмнасць у рабоце, адказнасць, актыўнасць, самастойнасць, ініцыятыўнасць і іншыя якасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**А.А.Трусаў,** *дацэнт*

## АСАБЛІВАСЦІ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА ПА ГІСТОРЫІ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры дысцыпліна «Гісторыя матэрыяльнай культуры» вывучаецца студэнтамі, якія навучаюцца па спецыяльнасці «музеязнаўства і ахова помнікаў гісторыі і культуры», на другім курсе. Агульная колькасць гадзін – 96. Асноўныя формы заняткаў – лекцыі і семінары. Форма кантролю – экзамен.